А. К. Грабоўскі, А. А. Яцкоў

# ГЕНАЦЫД БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

*У дакладзе разглядаюцца канкрэтныя прыклады праявы гітлераўскай палітыкі генацыду беларускага насельніцтва на тэрыторыі Гомельшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.*

З першых дзён акупацыі і на працягу трох гадоў 1941–1944 гг. гітлераўцы ажыццяўлялі злачынную палітыку генацыду і выпаленай зямлі ў Беларусі: карныя аперацыі і тысячы спаленых вёсак, лагеры смерці, турмы і гета, публічныя пакаранні смерцю і масавыя расстрэлы людзей. Беларусь панесла велізарныя матэрыяльныя разбурэнні і дэмаграфічныя страты [1]. Гомельшчына, як і ўся Беларусь, спаўна выпрабавала на сабе жахі Вялікай Айчыннай вайны.

Дзейсным спосабам знішчэння савецкіх грамадзян стала стварэнне нацыстамі канцлагераў для ваеннапалонных: дулагаў – перасыльных лагераў, шталагаў – лагераў для радавых і сяржантаў, афлагаў – лагераў для афіцэраў. У верасні 1941 г. камандаваннем нямецка-фашысцкіх войск у паўночна-заходняй частцы г. Гомеля у межах вуліц Савецкай, Тэльмана, Поратавай і завулка Ваеннага был арганізаваны «Цэнтральны перасыльны лагер ваеннапалонных № 121» (далей – Дулаг-121).

Да сярэдзіны верасня ў ім знаходзілася 8500 чалавек пры дапушчальнай змяшчальнасці 5000 чалавек, а на 11 снежня 1941 г. было ўжо 12857 ваеннапалонных. Архіўныя крыніцы сведчаць, што акрамя ваеннапалонных у лагеры таксама ўтрымлівалася цывільнае насельніцтва, родныя партызан, у тым ліку непаўналетнія.

Значная частка ваеннапалонных знаходзілася пад адкрытым небам, незалежна ад пары года і ўмоў надвор'я. Штодзённая смяротнасць дасягала 500, а ў зімовы час 1000 чалавек у дзень. У лагеры ўтрымліваліся 30–35 тысяч, а часам і да 60 тысяч заняволеных.

За найменшае парушэнне лагернага парадку людзе прывязвалі да слупа, пасля чаго каты па-зверску збівалі іх гумавымі дубінкамі, паркамі, прыкладамі, дротам. Мелі месца факты збіцця і расстрэлу дзеля забавы. Многія грамадзяне даводзіліся да стану адчаю і канчалі жыццё самагубствам, альбо правакавалі на расстрэл. Каты не паспявалі вывозіць з лагера трупы загінулых. Таму ўстанавілі за лагерам некалькі спецыяльных печаў, у якіх спальвалі забітыя імі ахвяры. Такія печы працавалі круглыя суткі.

10 кастрычніка 1943 г. нямецкая адміністрацыя, у сувязі з эвакуацыяй лагера, перадала ў гарадскі шпіталь 600 хворых ваеннапалонных. Праз некаторы час немцы ўзарвалі шпіталь разам з людзьмі, што знаходзіліся ў ім.

Пасля вызвалення Гомеля ад нацысцкай акупацыі Спецыяльная гарадская камісія ажыццявіла ракопкі месцаў масавых пахаванняў. У выніку было ўстаноўлена, што нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гомельскім лагеры № 121 знішчана за час яго існавання больш за 110 тыс. савецкіх грамадзян [3].

Згодна з дадзенымі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, акрамя Дулага-121 у Гомелі таксама функцыянавалі і іншыя месцы прымусовага ўтрымання цывільнага насельніцтва: чатыры яўрэйскіх гета, Гомельская абласная турма, камера папярэдняга заняволення Гомельскага ГФП, лагер цывілінага насельніцтва № 127, лагер цывільнага насельніцтва па вул. Будёнага, лагер цывільнага насельніцтва па увл. Савецкай. Па дадзеных пракуратуры г. Гомеля ў горадзе за перыяд акупацыі было знішчана да 140 000 чалавек, у тым ліку да 30 000 мясцовых жыхароў і не менш за 110 000 савецкіх ваеннапалонных.

Такім чынам, прыведзеныя факты – толькі частка прыкладаў, пераканаўча ілюструючых бесчалавечную сутнасць мэтанакіраванай палітыкі знішчэння беларускага народа, які не скарыўся акупантам, у гады Вялікай Айчыннай вайны.

### *Спіс літаратуры*

1. Яцкевич, Н. А. Музейные документы о геноциде белорусского народа в годы Великой Отечественной войны / Н. А. Яцкевич // Сайт Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.warmuseum.by/news. – Дата доступа: 15.03.2026.
2. Геноцид в г. Гомеле во время ВОВ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://gdsk.by. – Дата доступа: 15.03.2026.

*Грабоўскі Аляксей Кірылавіч*, студэнт 2 курса ФИТУ БГУИР, aleshamayg@gmail.com
*Яцкоў Андрэй Андрэевіч*, студэнт 2 курса ФИТУ БГУИР, AndreiYatskovJR@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, заведующий кафедрой гумантитарных дисциплин БГУИР, кандидат исторических наук, доцент, Mikalayeva@bsuir.by